Ларыса Таірава

# "СЛАВЯНСКАГА ВЯНКА" ЦУДОЎНАЕ ПЛЯЦЕННЕ



**Аляксандр Цыганкоў і Мікалай Марэцкі падчас сумеснага музіцыравання.**

Хто любіць восень з яе холадам, бясконцымі дажджамі, першым мокрым снегам? Але менавіта мастацтва зрабілася тым светлым промнем, які сагрэў нашы сэрцы, пазбавіў іх холаду і змроку, усяліў надзею і натхненне. Такім светлым промнем сталася Дэкада народнаінструментальнага мастацтва, якая адбылася летась у межах штогадовага фестывалю "Беларуская музычная восень".

Ідэя правядзення Дэкады належыць Асацыяцыі беларускіх дамрыстаў і мандалiністаў (АБДМ), якая была створана на пачатку 90-ых гадоў і ажывіла наша культурнае жыццё, зрабіла яго больш цікавым і разнастайным. Ідэя знайшла падтрымку Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Саюза музычных дзеячаў, Белдзяржфілармоніі, якія фінансавалі свята.

Залатой, сувязной ніткай дэкаднага "Вянка" зрабіўся выдатны музыкант, кампазітар, дамрыст, заслужаны артыст Расіі, лаўрэат міжнародных конкурсаў Аляксандр Цыганкоў. Гэтае імя добра вядома не толькі ў Беларусі. Дэмакратызм, жыццялюбства, аптымістычнае светаўспрыманне дазваляюць А.Цыганкову знаходзіцца ў віры падзей постсавецкай культурнай прасторы і ўсюды паспяваць. Вакол А.Цыганкова гуртуюцца музыканты-"народнікі" ўсіх рангаў і жанравых накірункаў (дамрысты, балалаечнікі, цымбалісты, баяністы, прафесійныя артысты і аматары, прафесары і студэнты, прадстаўнікі сумежных краін, сталічнага бамонда і педагогі перыферыйных школ) — і для ўсіх у яго знаходзяцца дзейсная падтрымка, зарад натхнення. А.Цыганкоў не толькі бліскучы музыкант-выканаўца, ён яшчэ і арганізатар сучаснага домравага выканальніцтва. Яскравае пацвярджэнне гэтага — арганізаваныя А.Цыганковым міжнародныя конкурсы выканаўцаў на народных інструментах у Чарапаўцы, дзе беларусы неаднаразова здабывалі перамогу. Летась А.Цыганкову споўнілася 50 гадоў. Напярэдадні свайго залатога юбілею знакаміты музыкант ажыццявіў дзесяцідзённы гастрольны тур па Беларусі.

Не менш значнай дзеючай асобай дэкадных мерапрыемстваў стаўся, акрамя А.Цыганкова, вядомы беларускі музыкант, бліскучы дамрыст і мандаліністт, лаўрэат міжнародных конкурсаў, саліст Белдзяржфілармоніі Мікалай Марэцкі. Амаль кожны год выступленні гэтага музыканта робяцца падзеямі ў канцэртным жыцці нашай краіны і за яе межамі. Дастаткова прыгадаць сольныя праграмы М.Марэцкага — "Мандалінныя прэм'еры", "Мандаліна і свет Мсціслава Растраповіча", а таксама міжнародны фестываль з удзелам беларускіх, расійскіх і нямецкіх музыкантаў — так званыя "Дні мандалiннай музыкі", пра што распавядаў часопіс.

На працягу ўсяго гастрольнага маршруту М.Марэцкі і А.Цыганкоў выступалі ў дуэце. Акрамя таго, Марэцкі ўзяў на сябе адказную ролю менеджэра і, як адзначыў госць, — "выдатна з ёю справіўся". Распрацоўка гастрольнага маршруту, папярэднія перамовы з кіраўнікамі калектываў і рассылка партытур, складанне раскладу рэпетыцый, вызначэнне ўмоў і месцаў выступленняў, арганізацыя гасцініцы, транспарту і мноства розных дробязяў — усё гэта выконвалася з бездакорнай дакладнасцю. І ў гэтым праявілася яшчэ адна рыса характару М.Марэцкага — яго арганізатарскі талент.

"Славянскі вянок" абвіў сваім святочным пляценнем амаль усю Беларусь, сабраўшы самыя лепшыя кветкі народнаінструментальнага мастацтва. Надзвычай шчыльны гастрольны маршрут (што ні дзень, то новыя гарады, новыя калектывы — аркестры і ансамблі народных інструментаў) пачаўся са старажытнай полацкай зямлі. Тут, у Сафійскім саборы, адбыўся сумесны канцэрт А.Цыганкова і цікавага ансамбля народнай музыкі "Талака", якім кіруюць вядомы беларускі кампазітар Віктар Малых і яго жонка Галіна. Потым быў Віцебск, і дэкадны вянок папоўніўся яшчэ адной чароўнай кветачкай — ансамблем балалаек "Віцебскія віртуозы" пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Тамары Шафранавай. У гэтым годзе "Віртуозы" будуць святкаваць сваё 25-годдзе. Таму выступленне ансамбля балалаек з артыстамі такога рангу, як А.Цыганкоў і М.Марэцкі, на пачатку юбілейнага сезона — вельмі пачэсная і адказная місія, з якой ён выдатна справіўся.

Трэба адзначыць, што дэкадныя канцэрты ва ўсіх гарадах, па якіх пралягаў шлях "Славянскага вянка", праходзіў па адзінай, загадзя вызначанай праграме. Першае аддзяленне кожнага канцэрта было аддадзена маскоўскім гасцям. (Актыўны ўдзел у гэ-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

тай часткі канцэртаў прымала нязменны акампаніятар А.Цыганкова, яго паплечніца і жонка, дыпламант міжнароднага конкурсу Іна Шаўчэнка.) Другое аддзяленне ўключала асобныя сольныя нумары лепшых калектываў, якія працуюць у гарадах — удзельніках Дэкады, таксама сумесныя выступленні гэтых калектываў з А.Цыганковым і М.Марэцкім. Так было і ў Магілёве, дзе да "Славянскага вянка" далучылася адна з самых яскравых кветак нашага народнаінструментальнага мастацтва — Аркестр народных інструментаў Магілёўскай абласной філармоніі пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Леаніда Іванова.

У Гомельскім каледжы мастацтваў імя Н.Сакалоўскага прымалі эстафету "Славянскага вянка". Грунтоўна рыхтаваліся да сустрэчы з гасцямі вядучыя калектывы гэтай установы — аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам У.Птушанёнка і квартэт баяністаў пад кіраўніцтвам Б.Давыдава. Перапоўненая канцэртная зала каледжа, неверагодная колькасць кветак і хвалі апладысментаў — сведчанне таго, што ў Гомелі ўмеюць шанаваць сапраўднае мастацтва.

Прыкметнай рысай Дэкады зрабілася далучэнне да народнаінструментальнай галіны выканальніцтва калектываў з іншых сфер інструментальнага мастацтва. Так, напрыклад, Брэсцкая абласная філармонія ў суквецце "Вянка", акрамя ансамбля народных інструментаў пад кіраўніцтвам А.Гаркоўскага, прапанавала ўключыць Струнны камерны аркестр (дырыжор А.Мартыненка), які вельмі арганічна ўвайшоў у агульную святочную карціну.

На шосты дзень "Славянскі вянок" нарэшце трапіў у сталіцу, дзе з нецярплівасцю чакалі прыезду гасцей. Насычаная трохдзённая праграма сталічнага свята складалася з шэрага разнастайных канцэртаў у розных канцэртных залах з самымі вядомымі прафесійнымі калектывамі. Каго тут толькі не было, у гэтым непаўторным музычным суквецці, — Дзяржаўны аркестр народных інструментаў імя І.Жыновіча, Камерна-інструментальны ансамбль Белдзяржтэлерадыё, Камерны канцэртны аркестр народных інструментаў, ансамбль народных інструментаў Мінскага музычнага вучылішча! На адной сцэне разам з А.Цыганковым і М.Марэцкім імкнуліся выступаць пачынаючыя дамрысты, студэнты Акадэміі музыкі і сталыя салісты народнаінструментальнага жанру, такія як Л.Рыдлеўская і М.Ільіна. У межах Дэкады адбыліся творчыя сустрэчы, кансультацыі і майстар-класы А.Цыганкова.



**А.Цыганкоў і М.Марэцкі з ансамблем народных інструментаў Мінскага музвучылішча і ансамблем дамрыстаў Акадэміі музыкі.**

Цэнтральнай, кульмінацыйнай падзеяй усёй Дэкады, свайго роду падзеяй часу зрабіўся канцэрт у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі, дзе А.Цыганкоў упершыню ў гісторыі музычнага мастацтва іграў з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам Беларусі. Прызнацца, з хваляваннем і неспакоем чакалі слухачы канцэрта — ці здолее маленькая домра з яе крохкім, пяшчотным гукам пераадолець моц сімфанічнага акампанементу, ды яшчэ ў такой акустычна складанай зале?!... Але з першымі тактамі ўпэўненай, неверагодна майстэрскай ігры А.Цыганкова, яго цудоўнай, захапляльнай музыкі ўсе сумненні адразу зніклі. На сцэне быў чараўнік, які тварыў штосьці неверагоднае!



**У час выступлення з сімфанічным аркестрам у зале Белдзяржфілармоніі.**

А домру ў сімфанічным абрамленні было не пазнаць. Яна рассыпалася бісерам крыштальна празрыстых гукаў у "Карагодзе гномаў" А.Бацыні, ласкава спявала і самазабыўна скакала ў "Венецыянскім карнавале" Н.Паганіні, вытанчана вальсіравала ў Фантазіі Г.Вяняўскага на тэмы оперы "Фауст" Ш.Гуно. Калі ў фінале вечара да А.Цыганкова далучыўся М.Марэцкі для выканання "Навары" П.Сарасатэ, зала апладзіравала стоячы. Заслужанаму поспеху ўсіх удзельнікаў канцэрта спрыяў малады беларускі дырыжор Андрэй Галанаў.

Так "Славянскі вянок" завяршыў сваё святочнае кола.

**Фота С.Бурава.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ